11. *Karbowiak, A.* Dzieje wychowania i szkól w Polsce: w 3 t. / A. Karbowiak. – Lwów – Warszawa – Kraków: Wyd-wo zakładu narodowego im. Ossolińskich, 1923. – T. 3. – 1923. – 564 s.

12. *Галенчанка, Г. Я.* Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар / Г. Я. Галенчанка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 280 с.

13. *Muczkowski, J.* Mieszkania i postępowanie uczniów krakowskich w wiekach dawniejszych / J. Muczkowski. – Kraków: Nakł. i czcionkami J. Czecha, 1842. – VI, 158 s.

14. *Jan z Trzciany.* Zywot błogosławionego Michała Gedrocia xiążęćia litewskiego zakonnika S. Rządu Kanonikow BB. Martyrum de Poenitentia od Demetriusa Rzymianina tamże w Rzymie napierwszego fundatora y patryarchy postanowionego, ktorego ciało odpoczywa w Krakowie w kośiele S. Marka, z originału własnego wyięty / Jan z Trzciany. – Kraków: Druk. S. Kempini, 1615. – 38 k.

15. *Wolff, J.* Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku / J. Wolff. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1895. – XXV, 698 s.

16. *Lulewicz, H.* Radziwiłł Mikołaj zwany Czarnym / H. Lulewicz // Polski Słownik biograficzny. – Warszawa; Kraków: Wyd-wo PAN, 1987. – T. XXX. – S. 335–347.

17. *Ragauskienė, R.* Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės kancleris Mikalojus Radvila Rudasis (apie 1515–1584 m.) / R. Ragauskienė. – Vilnius: Valstybės žinios, 2002. – 447 p.

18. *Estreicher, K.* Bibliografia polska: w 4 cz.; 37 t. / K. Estreicher, S. Estreicher. – Kraków: Druk. Uniwersytetu Jagiellońskiego, 1870–1939. – Cz. 3: Stólecie XV–XVIII w układzie abecadłowym. – T. 4. – 1897. – VIII, 475, V s.; T. 5. – 1898. – 377, XXXIV s.; T. 6. – 1899. – 491, V s.; T. 7. – 1901. – 705, VI s.; T. 12. – 1910. – 545, XLIII s.

**(Дата падачы: 17.02.2023 г.)**

*I. A. Саракавік*
Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Мінск

*I. A. Sorokovik*
Presidential Academy of Management Republic of Belarus, Minsk

**УДК 94:340(476)**

# АДМЕТНАСЦІ РАЗВІЦЦЯ АКАДЭМІЧНАЙ ЮРЫДЫЧНАЙ НАВУКІ Ў ПЕРШЫЯ ГАДЫ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ: ГІСТОРЫКА-ПРАВАВЫ ЗРЭЗ

# FEATURES OF THE DEVELOPMENT OF ACADEMIC LEGAL SCIENCE IN THE FIRST YEARS OF INDEPENDENCE OF THE REPUBLIC OF BELARUS: HISTORICAL AND LEGAL CROSS-SECTION

*Артыкул прысвечаны адметнасцям развіцця акадэмічнай юрыдычнай навукі ва ўмовах, калі распаўся Савецкі Саюз і была абвешчана суверэннасць Рэспублікі Беларусь, калі юрыдычна не стала савецкага грамадска-палітычнага ладу і былі зроблены першыя крокі па ўсталяванні новага.*

*Ключавыя словы: юрыдычная навука; навуковыя тэмы; Савецкі Саюз; незалежнасць; Акадэмія навук; Інстытут філасофіі і права; Рэспубліка Беларусь.*

*The article is devoted to the peculiarities of the development of academic legal science in the conditions when the Soviet Union collapsed and the sovereignty of the Republic of Belarus was proclaimed, when the Soviet socio-political system legally disappeared, and the first steps were taken to establish a new one.*

*Keywords: legal science; scientific topics; Soviet Union; independence; Academy of Sciences; Institute of Philosophy and Law; Republic of Belarus.*

З утварэннем незалежнай Рэспублікі Беларусь з’явілася магчымасць засяродзіць увагу на даследаванні тых праблем юрыдычнай навукі дзяржавы, якія не падрымліваліся савецкай уладай па ідэалагічных і палітычных прычынах. Не стала і кантролю з агульнасаюзнага Цэнтра, што спрыяльна ўздзейнічала на творчую актыўнасць юрыдычных навуковых кадраў. З’явілася магчымасць лепш пазнаёміцца з навейшымі дасягненнямі навуковых даследаванняў вучоных Захаду, не адмаўляючыся ад лепшых даследаванняў савецкай юрыспрудэнцыі. У той жа час распад Савецкага Саюза стаў і негатыўнай з’явай, адна з іх – звужэнне кантактаў з навуковымі цэнтрамі былых саюзных рэспублік, што, безумоўна, адмоўна ўплывала на развіццё айчыннай юрыдычнай навукі. Аднак развіццё Інтэрнета дазволіла ў пэўнай ступені зменшыць гэтыя наступствы, хоць асабістыя, непасрэдныя кантакты не змаглі замяніць нават навейшыя тэхнічныя дасягненні.

Асаблівасць развіцця юрыдычнай навукі і адукацыі Беларусі ў гэты перыяд заключаецца і ў тым, што знікла магчымасць карыстацца навуковымі юрыдычнымі дасягненнямі Саюзнага цэнтра, у якім былі сканцэнтраваны найбольш высокакваліфікаваныя тэарэтычна і практычна юрыдычныя навуковыя кадры Савецкага Саюза. Не стала Асноў заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік па тых ці іншых галінах права. Цяпер патрэбна было самім вучоным Беларусі самастойна вызначыць свой падыход да розных праблем развіцця права. Так, даследчыкам і выкладчыкам патрэбна было не чакаць, напрыклад, Асноў саюзнага заканадаўства па пэўнай галіне права і на гэтай аснове прыстасоўваць іх да патрэб рэспублікі, а самастойна распрацоўваць дзяржаўнае заканадаўства. Зразумела, што ў цэлым дзяржава для гэтага не была гатова і таму часта для арыентыра брала замежныя напрацоўкі ў пэўнай сферы права. Не хапала і вузкіх спецыялістаў. Аднак з часам гэтыя прабелы паступова сталі вырашацца.

З першых гадоў дзяржаўнай незалежнасці Рэспублікі Беларусь прававыя падраздзяленні Інстытута філасофіі і права ва ўмовах складанага сацыяльна-эканамічнага становішча дзяржавы, выкліканага найперш распадам Савецкага Саюза, працавалі над дзвумя актуальнымі для гэтага часу Рэспубліканскімі комплекснымі праграмамі: «Чалавек, культура, навука: праблемы гуманізацыі сацыяльна-палітычных і маральна-прававых адносін» і «Суверэнітэт Рэспублікі Беларусь – эканамічны, прававы і сацыялагічны аспекты». Па першай праграме даследаванні праводзіліся па 11 тэмах,

а па другой праграме – па трох. На гэты час прыходзіцца важнае для дзяржавы даследаванне ў адпаведнасці з Рэспубліканскай праграмай ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС «Абгрунтаванне эканамічнай мэтазгоднасці вытворчай дзейнасці і вывучэнне сацыяльна-псіхалагічных і прававых аспектаў жыццядзейнасці на забруджанай тэрыторыі» [1, арк. 2].

Працуючы над тэмай «Рэспубліка Беларусь: суверэнітэт, кампетэнцыя і арганізацыйна-прававыя праблемы кіравання. Гарантыі аховы правоў грамадзян» (у далейшым тэма была скарэктавана і значылася наступным чынам «Рэспубліка Беларусь: суверэнітэт, кампетэнцыя і гарантыі іх рэалізавання» [2, арк. 8] (кіраўнік – член-карэспандэнт АН Беларусі В. І. Шабайлаў), аўтарскі калектыў асаблівую ўвагу надаў, з аднаго боку, праблемам дзяржаўнага кіравання ва ўмовах адсутнасці саюзнага цэнтра і неабходнасці многія пытанні вырашаць самастойна, тады калі раней гэта рабіў Цэнтр у асобе вышэйшага кіраўніцтва СССР. З другога боку, асаблівае значэнне надавалася распрацоўцы пытання гарантыі аховы правоў грамадзяніна, а не дзяржавы, як гэта рабілася ў саюзны перыяд. Упершыню даследаваліся суадносіны дзяржаўнага і нацыянальнага суверэнітэту, пытанні падзелу ўлады і формы яго рэалізацыі, што мела важнае значэнне пры падрыхтоўцы першгай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Не меншае значэнне мела і тэма «Фарміраванне прынцыпаў новага заканадаўства і праватворчасці» (кіраўнік тэмы – кандыдат юрыдычных навук В. М. Арцёмава) [1, арк. 10]. У прыватнасці, дзеля забеспячэння суверэннасці дзяржавы творчы калектыў даследаваў асноўныя прынцыпы: прыярытэт інтарэсаў асобы і забеспячэнне яе правоў і свабод, абгрунтаванасць закона, яго вяршэнства ў сістэме заканадаўчых актаў.

Навуковы калектыў пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта АН Беларусі В. І. Семянкова працаваў над тэмай «Удасканаленне працоўнага і гаспадарчага заканадаўства, прававога забеспячэння кіравання і самакіравання ў сферы вытворчасці ва ўмовах расшырэння суверэнітэту рэспублікі» [1, арк. 11]. Упершыню, улічваючы існаванне не толькі дзяржаўнай, але і прыватнай уласнасці, быў прааналізаваны новы змест працоўнай правасуб’ектнасці наймальніка, працаўніка, прафсаюзаў, дзяржавы. Асаблівая ўвага была звернута на даследаванне праблем працоўнай правасуб’ектнасці ўласнікаў-заснавальнікаў (членаў, удзельнікаў) кааператываў, якія з’явіліся яшчэ ў гады перабудовы.

Новыя падыходы сталі праглядвацца і пры распрацоўцы тэмы «Развіццё сацыялістычнай дэмакратыі і паглыбленне самакіравання народа» пад кіраўніцтвам кандыдата юрыдычных навук А. У. Матусевіча [1, арк. 12–13]. З аднаго боку, аўтары кіраваліся ранейшай катэгорыяй «сацыялістычная дэмакратыя», хоць суверэнная Беларусь апынулася ў пераходным перыядзе ад савецкага сацыялізму да рынавых адносін. З другога боку, назіраецца новы падыход да самакіравання народа. У прыватнасці, прааналізавана ўзаемадзеянне органаў дзяржаўнай улады і кіравання з грамадскімі аб’яднан-

нямі і працоўнымі калектывамі ў вызначэнні зместу палітыкі і канкрэтных упраўленчых рашэнняў, чаго раней у такім фармаце не разглядалася. Вызначана месца і роля працоўнага калектыву ў сферы кіравання працай на прадпрыемстве ў залежнасці ад формы яго ўласнасці і прапанаваны механізм адносін паміж уласнікамі маёмасці і працоўным калектывам на прынцыпах сацыяльнага партнёрства пры разумнай меры кампрамісу ў канфліктных сітуацыях. Адначасова прааналізавана новая прававая мадэль пры падборы кадраў у сферы рыначных адносін – кантракт, які адлюстроўвае агульныя тэндэнцыі развіцця працоўнага права: яго дэмакратызацыю, павышэнне ролі індывідуальных пагадненняў у рэгуляванні ўмоў працы і яе аплаты. Аднак прадугледзіць многія наступствы кантрактнай сістэмы аўтары не змаглі: не існавала фактычнага матэрыяла для аналіза.

Навуковы калектыў на чале з членам-карэспандэнтам АН Беларусі М. В. Сторажавым актыўна працаваў над тэмай «Удасканальванне арганізацыйна-прававых формаў сельскагаспадарчай вытворчасці, зямельнай рэформы, аховы і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў» [1, арк. 13]. Ён распрацаваў прапановы, што вельмі важна, па ўдасканальванні заканадаўства: аб прававым статусе сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак і практыкі яго прымянення; ахове і рацыянальным выкарыстанні зямель ва ўмовах зямельнай рэформы; арганізацыйна-прававых формах і метадаў дзейнасці аграпрамысловых біржаў і практыкі яго прымянення; ахове і рацыянальным выкарыстанні карысных выкапняў.

Супрацоўнікі прававых аддзелаў Інстытута філасофіі і права не толькі прадаўжалі займацца тэарэтычнымі даследаваннямі, але і практыкаарыентаванай дзейнасцю. Толькі ў 1992 г. яны падрыхтавалі і накіравалі ў адпаведныя вышэйшыя органы ўлады і кіравання Беларусі экспертныя заключэнні на 24 праекты нарматыўных прававых актаў (у 1993 г. – 28), а таксама дзве аналітычныя запіскі «Аналіз нарматыўных актаў, якія рэгламентуюць дзейнасць устаноў культуры» і «Аб парадку фінансавання і льготах па падаткаабкладанні ў сферы навукі і культуры ў развітых капіталістычных краінах». Апрача таго, супрацоўнікі прымалі актыўны ўдзел у складзе працоўных груп па падрыхтоўцы шэрагу законапраектаў і іх абмеркаванні ў Камісіях Вярхоўнага Савета і на сесіях Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь [1, арк. 16].

У гэтым жа годзе А. У. Матусевіч выдаў манаграфію «Политическая система: состояние и развитие», І. П. Сідзельнікаў – «Доступность закона: правовое информирование граждан», а калектыў аўтараў (В. М. Арцёмава, В. А. Круталевіч, А. П. Марыкаў і інш.) – «Правовая реформа: повышение действенности права. У 1994 г. В. П. Слабажанін надрукаваў манаграфію «Земское самоуправление в Беларуси (1905–1917 гг.)» [3].

Складанае сацыяльна-эканамічнае становішча, вялізная інфляцыя ў Беларусі ў сувязі з распадам Савецкага Саюза негатыўна адбіліся на кадравым навуковым стане. Толькі на працягу 1992 г. з Інстытута філасофіі і права

выбыла 20 чалавек [1, арк. 22]. Прычыны звальнення – нізкая заработная плата і скарачэнне штатаў ва ўмовах дэфіцыту фінансавання. Страта грамадствам былых арыенціраў і каштоўнасцей, разбурэнне метадалагічных і светапоглядных установак, змена навуковай праблематыкі, пераапрацоўка ўжо падрыхтаваных раней тэкстаў, пошук новага ідэйнага зместу і формаў навукова-даследчай і навукова-метадалагічнай працы, падзенне прэстыжу навукі – ўсё гэта негатыўна ўплывала на дзейнасць навуковых кадраў, у тым ліку і на аспірантаў пры Інстытуце. Працэс гэты прадаўжася ў пэўнай ступені па другую палову 1990-х гг. Тым не менш, асноўны кадравы састаў юрыдычных падраздзяленняў Інстытута філасофіі і права працягваў актыўна дзейнічаць.

Працуючы далей над тэмай «Рэспубліка Беларусь: суверэнітэт, кампетэнцыя і гарантыі іх рэалізавання», аўтары паспрабавалі раскрыць сутнасць і змест сацыяльнай дзяржавы, ўмовы яе станаўлення і развіцця. Яна разглядалася імі як супольнасць, заснаваная на партнёрстве розных сацыяльных груп насельніцтва, ў якой створаны перадумовы для ўсталявання адносна высокага дабрабыту ўсяго ці пераважнай большасці народа і якая забяспечвае абарону састарэлых, шматдзетных сем’яў, а таксама іншых сацыяльна неабароненых груп насельніцтва. Астанаўліваюцца яны і на неабходнасці далейшага ўдасканалення прававога статуса Прэзідэнта, яго адміністрацыі і Кабінета Міністраў дзяржавы, улічваючы тое, што ў рэальных умовах існуючая адміністрацыя Прэзідэнта, яе паўнамоцтвы не маюць канстытуцыйнай асновы. У сувязі з гэтым абгрунтоўваецца неабходнасць прыняцця Закона «Аб падзеле і адзінстве дзяржаўнай улады і прынцыпах іх функцыяніравання» [4, арк. 13].

Далейшую распрацоўку мела і тэма «Фарміраванне прынцыпаў новага заканадаўства і праватворчасці». Аналізуючы законатворчасць парламента Рэспублікі Беларусь, навуковы калектыў на чале з кандыдатам юрыдычных навук В. М. Арцёмавай прыйшоў да высновы, што прынцыпы права як асноватворчыя ідэі, сістэмаўтваральныя фактары не занялі належнага месца. У прыватнасці, адсутнічае канцэпцыя новых узаемаадносін чалавека і дзяржавы пры пераходзе да рынкавых адносін, не вызначаны важнейшыя прынцыпы іх узаемадзеяння і мадэль новага грамадства. Гэта прыводзіць да спантаннага, супярэчлівага і нестабільнага развіцця заканадаўства, накіраванасць яго на вырашэнне часовых задач, выкліканых крызісным станам грамадства, і пакідае адкрытым шэраг важных пытанняў (функцыі сацыяльнай абароны чалавека, межы рэгулявання эканомікі і сацыяльнай сферы, пераразмеркаванне прыбыткаў паміж рознымі сацыяльнымі пластамі грамадства і выраўніванне сацыяльнай няроўнасці, дзеянне прынцыпаў сацыяльнай справядлівасці і маральнасці ў новых умовах, узаемнай адказнасці асобы і дзяржавы і інш.). Зроблены вывад пра тое, што побач з ігнараваннем прынцыпа права негатыўныя вынікі для працэса дэмакратызацыі дзяржаўнага і грамадскага жыцця краіны мае і іх фармальнае замаца-

ванне ў законе, а яно не забяспечана адпаведнымі сацыяльна-эканамічнымі, арганізацыйнымі, псіхалагічнымі і юрыдычнымі механізмамі рэалізацыі і абароны. Прынцыпы прыярытэту правоў і інтарэсаў чалавека, прымату агульначалавечых каштоўнасцей, верхавенства закона, канстытуцыйнасці прававых нормаў і іх адпаведнасці міжнародна-прававым талонам і стандартам не атрымлівалі рэальнага ўвасаблення ў жыцці ў сувязі з адсутнасцю адпаведных забеспячальных і кантрольна-ахоўных механізмаў [4, арк. 15].

Аналагічная праца прадаўжалася і над тэмамі «Удасканаленне працоўнага і гаспадарчага заканадаўства, прававога забеспячэння кіравання і самакіравання ў галіне вытворчасці ва ўмовах суверэнітэту» пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта АН Беларусі В. І. Семянкова [4, арк. 16], «Прававое забеспячэнне аграрнай рэформы, рацыянальнага выкарыстання і аховы зямельных і лясных рэсурсаў» (кіраўнік – член-карэспандэнт АН Беларусі М. В. Сторажаў) [4, арк. 17–18].

Усяго ў 1995 г. было пададзена экспертных заключэнняў на больш чым 40 нарматыўных прававых актаў. Акадэмічныя юрысты прымалі актыўны ўдзел у складзе рабочых груп па падрыхтоўцы законапраектаў, абмеркаванні праектаў законаў у камісіях Вярхоўнага Савета дзяржавы, удзельнічалі ў якасці экспертаў і кансультантаў у розных камісіях, нарадах, перамовах [4, арк. 23].

У 1995 г. В. А. Круталевіч выдаў манаграфію «На путях национального самоопределения: БНР – БССР – РБ», В. М. Арцёмава, А. П. Марыкаў, А. У. Матусевіч і інш. працу «Личность. Общество. Государство» [5], а В. А. Круталевіч, В. Р. Гаўрыленка – «Права, заканадаўства, палітыка» (6 д. а.) [6, арк. 27].

Пераўтварэнне Рэспублікі Беларусь з парламенцкай рэспублікі ў прэзідэнцкую на аснове першых выбараў кіраўніка дзяржавы з выцякаючымі наступствамі прывяло і да карэктыроўкі тэмаў навуковых даследаванняў акадэмічных юрыстаў. Член-карэспандэнт АН Беларусі В. І. Шабайлаў са старшым лабарантам Н. М. Бахманавай працавалі над новай тэмай «Станаўленне і развіццё сацыяльна-прававой дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь: канстытуцыйныя аспекты» [7, арк. 10]. Аўтары першапачаткова вызначылі паняцце «сацыяльная дзяржава», яе задачы і функцыі. Адначасова абгрунтавалі неадпаведнасць паміж замацаванымі палажэннямі арт. Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (рэдакцыя 1994 г.) і зместам такіх артыкулаў, як 2, 13, 21, 42 і інш. Яны лічылі, што па свайму зместу яны адпавядаюць буржуазна-ліберальнай дзяржаве, а не сацыяльнай. Таму аўтары ўнеслі прапановы аб змене зместу арт. 2, 13, 21, 42 і інш. Канстытуцыі дзяржавы 1994 г., якія затым знайшлі адлюстраванне ў новай рэдакцыі Асноўнага закона (1996 г.).

Доктар юрыдычных навук А. Г. Цікавенка сумесна з кандыдатамі юрыдычных навук В. А. Кадаўбовічам, В. Н. Матарас і старшым лабаран-

там Н. М. Бахманавай займаліся тэмай «Выканаўчая ўлада ў сістэме дзяржаўных органаў: рэалізацыя прынцыпа падзелу ўлад, мясцовае самакіраванне і кіраванне ў Рэспубліцы Беларусь» [7, арк. 10–11]. Яны прыйшлі да высновы, што існуе пэўны дысбаланс паміж паўнамоцтвамі заканадаўчай і выканаўчай галінамі ўлады: заканадаўчая і судовая (Канстытуцыйны суд) маюць правы, а выканаўчая – па сутнасці толькі абавязкі. Даводзіцца неабходнасць прывядзення заканадаўства (Канстытуцыі) і практыкі дзейнасці дзяржаўных органаў у адпаведнасць з арт. 6 Канстытуцыі дзяржавы, збалансавання паўнамоцтваў галін улады. Іх прапановы былі замацаваны ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі (1996 г.).

Творчы калектыў на чале з кандыдатам юрыдычных навук В. М. Арцёмавай (доктар юрыдычных навук В. А. Круталевіч, кандыдаты юрыдычных навук А. П. Марыкаў, І. І. Пацяружа і старшы лабарант С. К. Чугаеўская) актыўна распрацоўвалі тэму па тэорыі права «Верхавенства права як аснова пабудовы сацыяльнай прававой дзяржавы ў Беларусі» [7, арк. 11–12]. Яны прааналізавалі ўзаемасувязь і ўзаемазалежнасць такіх інстытутаў, як дэмакратыя і права, дзяржава (улада) і права і на гэтай аснове абгрунтавалі палажэнне аб тым, што верхавенства права павінна стаць пануючай у заканадаўчым і палітычным мысленні. Навуковы калектыў пастараўся паказаць верхавенства права як сімвал найбольш важных аспектаў дэмакратычнага кіравання, маючы на ўвазе, што: згода народа павінна стаць асновай урадавых рашэнняў; патрэбна распрацоўка неабходных структур і працэдур, якія папярэджваюць самавольства ўлады і абараняюць фундаментальныя правы і свабоды асобы; неабходна ацэнка ўрадавых рашэнняў незалежнымі і непрадузятымі судамі і інш.

Навуковыя калектывы на чале з членамі-карэспандэнтамі АН Беларусі В. І. Семянковым і М. В. Сторажавым прадоўжылі працу над ранейшымі тэмамі, прысвечанымі працоўнаму і гаспадарчаму заканадаўству ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама прававому забеспячэнню аграрнай рэформы, рацыянальнаму выкарыстанню і ахове зямельных і лясных рэсурсаў [7, арк. 12–14].

У 1996 г. былі выдадзены дзве працы: В. І. Шабайлава (у сааўтарстве) «Проблемы формирования гражданского общества в Беларуси» і В. А. Круталевіча «О Конституционном суде, законности, референдуме» [8].

Нізкая публікатарская актыўнасць пачатку 1990-х гг. у многім тлумачыцца шэрагам фактараў. У першай палове 1990-х гг. назіралася вялікая інфляцыя ў дзяржаве, нізкая заработная плата, асабліва акадэмічных вучоных, многія з якіх змянілі свой род дзейнасці, змяншэнне фінансіравання як навукова-даследчых устаноў, так і выдавецтваў. Не меншае значэнне мела змяненне навуковых арыенціраў у сувязі з суверэннасцю, незалежнасцю Рэспублікі Беларусь. Да такога павората падзей многія даследчыкі не былі гатовы. Патрэбен быў час дзеля асэнсавання адбыўшагася, вызначэння

новых навуковых тэмаў, збора і апрацоўкі факталагічнага матэрыялу, яго апрацоўкі. На гэта патрабуецца не адзін год.

Не меншае значэнне мела і тое, што акадэмічныя юрысты актыўна прыцягваліся да законатворчай дзейнасці парламента Рэспублікі Беларусь, Савета Міністраў дзяржавы, а затым і Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. На гэта затрачвалася шмат часу. Практыкаарыентаванасць у 1990-х гг. выходзіла амаль на першае месца ў працы акадэмічных юрыстаў. Аднак паступова эканамічнае становішча з другой паловы 1990-х гг. паступова стала паляпшацца і гэта станоўча паўплывала на дзейнасць прававых аддзелаў Інстытута філасофіі і права.

У 1997 г. гэтыя аддзелы падрыхтавалі экспертных заключэнняў на больш чым 40 нарматыўных прававых актаў, у тым ліку на праекты: кодэксаў Грамадзянскага, Працоўнага, Жыллёвага, аб зямлі, аб шлюбе, сям'і і апецы, законаў «Аб грамадзянскай абароне», «Аб аўтамабільным транспарце Рэспублікі Беларусь», «Аб выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь» і інш. Больш за тое, акадэмічныя юрысты прымалі актыўны ўдзел у складзе сумеснай камісіі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі па дапрацоўцы Устава Саюза Беларусі і Расіі, а таксама яны ўдзельнічалі ў якасці экспертаў і кансультантаў у розных нарадах, камісіях Нацыянальнага сходу, перамовах [9, арк. 13].

Далейшае развіццё акадэмічнай юрыдычнай навукі Беларусі ва ўмовах яе суверэннасці змяншалася тым, што юрыдычныя аддзелы Інстытута філасофіі і права пэўным чынам стрымліваліся своеасаблівым сімбіозам: філасофіі і права. Рэзкае ўзрастанне неабходнасці законатворчасці і законапрымянення ў суверэннай Рэспубліцы Беларусь патрабавала самастойнага існавання акадэмічнай юрыдычнай установы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (далей – ЦНА НАН Беларусі). – Ф. 12. Воп. 1. Спр. 548.

2. Там жа. – Спр. 552.

3. *Матусевич, А. В.* Политическая система: состояние и развитие / А. В. Матусевич. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 244 с.; *Сидельников, И. П.* Доступность закона: правовое информирование граждан / И. П. Сидельников. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 123 с.; *Артемова, В. Н.* Правовая реформа: повышение действенности права / В. Н. Артемова, В. А. Круталевич, О. П. Мариков [и др.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 182 с.; *Слобожанин, В. П.* Земское самоуправление в Беларуси (1905–1917 гг.) / В. П. Слобожанин. – Минск: Гавриленко В. Г., 1994. – 83 с.

4. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 12. Воп. 1. Спр. 560.

5. *Круталевич, В. А.* На путях национального самоопределения: БНР – БССР – РБ / В. А. Круталевич. – Минск: Право и экономика, 1995. – 138 с.; *Артемова, В. Н.* Личность. Общество. Государство / В. Н. Артемова [и др.]. – Минск: Право и экономика, ЗАО «Вилат», 1996. – 121 с.

6. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 12. Воп. 1. Спр. 560.

7. Там жа. – Спр. 564.

8. Проблемы формирования гражданского общества в Беларуси / В. И. Карбалевич, [и др.]. – Минск: НЦСИ «Восток – Запад», 1996. – 80 с.; *Круталевич, В. А.* О Конституционном суде, законности, референдуме / В. А. Круталевич. – Минск: Право и экономика, 1996. – 141 с.
9. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 12. Воп. 1. Спр. 568.

**(Дата падачы: 25.01.2023 г.)**

*С. Ф. Свилас*
Белорусский государственный университет, Минск

*S. Svilas*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 327.7(476-69)ЮНЕСКО(091)**

# ПОЛИТИЧЕСКИЙ КРИЗИС ЮНЕСКО И ВКЛАД БЕЛОРУССКОЙ ССР В ЕГО ПРЕОДОЛЕНИЕ (1985–1989 ГГ.)

# THE POLITICAL CRISIS OF UNESCO AND THE CONTRIBUTION OF THE BYELORUSSIAN SSR TO OVERCOMING IT (1985–1989)

*В статье, основанной на документах МИД Белорусской ССР, раскрыт кризис ЮНЕСКО, связанный с выходом из Организации США (1985) и Великобритании (1986), рассмотрены предпринятые меры по его преодолению. Автор выявляет причины кризиса и его последствия, характеризует позицию западных, социалистических и развивающихся стран. Рассмотрены условия принятия и реализация Второго среднесрочного плана деятельности Организации (1984–1989 гг.), а также её усилия по разработке Третьего среднесрочного плана (1990–1995 гг.), принятого на 25-й сессии Генеральной конференции. Особое внимание уделено вкладу Белорусской ССР в преодоление кризиса, направлениям и формам сотрудничества республики с Организацией.*

*Ключевые слова: международное сотрудничество; ЮНЕСКО; Белорусская ССР; Второй среднесрочный план деятельности ЮНЕСКО; Третий среднесрочный план деятельности ЮНЕСКО; 25-я сессия Генеральной конференции ЮНЕСКО.*

*The article is based on the documents of the Ministry of Foreign Affairs of the Belarusian SSR. The author reveals the UNESCO crisis associated with the withdrawal from the Organization of the USA (1985) and Great Britain (1986), considers the measures taken to overcome it. The author identifies the causes of the crisis and its consequences, characterizes the position of western, socialist and developing countries. The conditions for the adoption and implementation of the Second Medium-term Plan of the Organization's activities (1984–1989) are analyzed, as well as its efforts to develop the Third Medium-term Plan (1990–1995), which was adopted at the 25th session of the General Conference. Special attention is paid to the contribution of the Byelorussian SSR to overcoming the crisis, the directions and forms of cooperation between the Republic and the Organization.*